**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”**
**Навукова-даследчы інстытут гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны**
**14 лістапада 2014 года**
**Праводзяць**

**Міжнародную навуковую канферэнцыю “Святло Скарынавых ідэй”, прысвечаную 90-годдзю з дня нараджэння прафесара У.В. Анічэнкі**

Праблемнае поле канферэнцыі:

1. Асоба прафесара У.В.Анічэнкі і яго роля ў развіцці беларускай лінгвістыкі.
2. Эпоха і справы Скарыны.
3. Традыцыі Ф.Скарыны.
4. Нацыянальная мова ў гістарычна-культурным працэсе.
5. Праблемы сучаснай дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі.
6. Вывучэнне розных узроўняў беларускай літаратурнай мовы.
7. Беларуская лексікаграфія.
8. Актуальныя пытанні анамастыкі.
9. Міжмоўная камунікацыя і моўныя кантакты.
10. Дыскусійныя пытанні этналінгвістыкі.
11. Мова і сродкі масавай камунікацыі.
12. Пераклад і інтэрпрэтацыя тэксту.
13. Стылістыка мастацкага слова.
14. Літаратуразнаўства.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская і іншыя славянскія, англійская мова.

Просім Вас даслаць заяўку на ўдзел у канферэнцыі і тэкст даклада на адрас Аргкамітэта да 24 верасня 2014 года.

**Арганізацыйны ўнёсак** эквівалентны 10 доларам ЗША.

Матэрыялы канферэнцыі будуць выдадзены як **зборнік артыкулаў**.

**Патрабаванні да афармлення артыкулаў**

1. Тэкст артыкула павінен уключаць: індэкс УДК, анатацыю на мове артыкула.

- УДК размяшчаецца злева без абзаца, набіраецца 12 кеглем.
- Прозвішча, ініцыялы аўтара размяшчаюцца праз 1 інтэрвал па цэнтры без абзаца, набіраюцца малымі літарамі 14 кеглем
- Назва артыкула размяшчаецца праз 1 інтэрвал па цэнтры без абзаца, набіраецца малымі літарамі 14 кеглем.
- Тэкст анатацыі размяшчаецца праз два інтэрвалы па шырыні, водступ для тэксту анатацыі 1, 3, набіраецца 11 кеглем.

2. Аб'ём ад 3 да 5 старонак

- Палі – усе па 2 см
- Шрыфт TNR, 12 кегль праз 1 інтэрвал
- Абзац 1,25 см.
- Тэкст артыкула набіраецца праз 1 інтэрвал пасля тэксту анатацыі.
- Спасылкі на літаратуру даюцца ў квадратных дужках

3. Слова “Літаратура” набіраецца праз 1 інтэрвал пасля асноўнага тэксту з абзаца 11 кеглем.

Матэрыялы, не прысвечаныя тэматыцы канферэнцыі і прысланыя пазней адзначанага тэрміну, разглядацца не будуць.

Выдаткі на праезд, харчаванне і пражыванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

Адрас для карэспандэнцыі: Беларусь 246019, г.Гомель, вул.Савецкая, 108, ГДУ імя Ф. Скарыны, кафедра беларускай мовы, Станкевіч Аляксандры Аляксандраўне ці Ермаковай Алене Мікалаеўне. Т. 602-265.
E-mail: astankevich@gsu.by
кафедра беларускай мовы: belchair@gsu.by

Заяўка
на ўдзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі
«Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час»
УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны"

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Месца працы, службовы адрас | |
| Навуковая ступень, званне, пасада | |
| Кантактныя тэлефоны (службж., маб., хатні) | |
| Назва даклада | |
| Секцыя | |
| Хатні адрас: | |
| E-mail | |
| Патрэба ў жыллі | |